# БЫВАЙ, НАВАПОЛАЦК! ПРЫВІТАННЕ, ПІНСК!

## або Ракіроўка культурных сталіц

**Ад Наваполацка ганаровы тытул культурнай сталіцы года Беларусі перадаецца Пінску. Наваполацк, які часта называюць «нафтаградам», «навукаградам», годна пацвердзіў, што ён яшчэ і «культураград».**




novaya.by

**Старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ** адзначыў, што адыходзячы год у рамках рэспубліканскай акцыі «Культурная сталіца Беларусі!» быў адным з самых насычаных культурнымі падзеямі — усяго іх арганізавалі па самых сціплых падліках каля дзвюх тысяч.

Сапраўды, жыхарам аднаго з самых маладых беларускіх гарадоў ёсць што ўспомніць. Вялікай культурнай падзеяй стала святкаванне юбілею Наваполацка. Мэр нагадаў, што сёлета ў чэрвені як ніколі раней маштабна адсвяткавалі 60-ю гадавіну заснавання. На святкаванні, якое расцягнулася на пару тыдняў, было шмат крэатыву і сюрпрызаў... Гэта ацанілі і госці з іншых гарадоў ды краін. А ў галоўны дзень урачыстасці сярод ганаровых удзельнікаў святкавання была і **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА**, якая, як вядома, узначальвала Наваполацкі гарвыканкам.

Дзмітрый Дзямідаў канстатаваў, што навапалачане дзякуючы новаму статусу горада адчулі, што насамрэч культурнае жыццё тут багатае, разнапланавае, мае вялікі патэнцыял. Яно і надалей будзе актыўна развівацца. Традыцыі, ідэі, адпрацаваныя сёлета, атрымаюць «новае дыханне».

Кіраўнік мясцовай выканаўчай улады ўпэўнены, што землякі маюць шмат магчымасцяў быць бліжэй да культуры. У прыватнасці, гараджане могуць рэалізаваць свой патэнцыял у творчых калектывах: званні «заслужаны», «народны», «узорны» ёсць у трыццаці з іх...

Дзякуючы супрацоўніцтву з адным з «брэндаў культуры» краіны — Вялікім тэатрам оперы і балета — традыцыйнымі сталі гастролі ў Наваполацку артыстаў гэтай установы культуры.

Сярод «візітных картак» культуры Наваполацка — міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-хало», міждзяржаўны конкурс юных піяністаў «Музычная лілея». Усё больш ахвотных узяць удзел у міжрэгіянальным конкурсе-пленэры «Палітра Прыдзвіння».

Пачалі рэалізоўвацца новыя праекты, або старыя набылі незвычайны фармат. Сярод такіх — фестываль урбаністычнага мастацтва «Жывы бетон», гарадскі фестываль бардаўскай песні «Сем струн душы», фестываль нацыянальнай культуры «Легенды Беларусі», конкурс ансамблевай музыкі «Вясновая фантазія» і гэтак далей.

Тыя, хто даўно не быў у горадзе, кажуць, што ён папрыгажэў. На вуліцах з'явіліся новыя так званыя малыя архітэктурныя канструкцыі. У вячэрнія і начныя гадзіны Наваполацк робіць казачным новая светлавая ілюмінацыя. На крамах, кавярнях, рэстаранах — банеры з фотаздымкамі самых прыгожых месцаў горада. І нават транспарт стаў «пазнавальным»: на аўтобусах можна ўбачыць летапіс «нафтаграда». А «Наваполацк у мініяцюры» стаў літаральна Меккай для гараджан і турыстаў: гэтая пляцоўка была ўсталяваная ў гарадскім парку...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**